# Энергія танца

**Не кожны можа пахваліцца, што здолеў вызначыцца з прафесіяй у раннім узросце. Гэта не тычыцца Валерыі Клінцовай, якая заўсёды востра адчувала сваё прызванне: яна павінна прысвяціць сябе танцу. Куды прывяла дзяўчыну любоў да харэаграфіі і чаго не бачыў "Дэнс Кангрэс"? Адказы — у інтэрв'ю з гераіняй рубрыкі "Максіма маладых".**



▲ Валерыя Клінцова

**— Валерыя, раскажыце, якім вы былі дзіцем?**

— Звышактыўнай, дапытлівай і дружалюбнай дзяўчынкай, якая нічога не баялася. Я не была сарамлівай. Думаю, на гэта паўплывала атмасфера свабоды, у якой мяне выхоўвалі. Ва ўсіх дзяцей пыталі: "Кім ты хочаш стаць, калі вырасцеш?" Я заўсёды адказвала: "Буду зоркай", хаця сама не разумела, што робяць такія людзі.

**— Як вы пазнаёміліся з танцам?**

— Па аповедах мамы, мае першыя крокі былі на дыбачках і мне спецыяльна клалі рукі на плечы, каб я апусцілася на ступні. Я заўсёды пртанцоўвала, і мяне называлі балерынай. Знаёмства з харэаграфіяй пачалося яшчэ ў дзіцячым садзе, а працягнулася ў гімназіі-каледжы мастацтваў горада Магілёва, дзе маім праваднікомy у гэтым творчым свеце стала выкладчык Марына Іванаўна Смірнова.

**— Цяпер вы студэнтка першага курса спецыяльнасці "Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)". Чаму захацелі вучыцца менавіта ў БДУКМ?**

— На маю думку, гэта самы маштабны і нават адзіны ў сваім родзе ўніверсітэт, дзе настолькі сканцэнтравана творчасць. Да паступлення я дакладна ўсведамляла, што хачу быць харэографам. Давялося выбіраць: пасля каледжа застацца і працаваць па размеркаванні ў родным горадзе ці паехаць у сталіцу, каб павысіць узровень у найлепшых педагогаў краіны. Другі варыянт падаўся больш прывабным. Я паспяхова вытрымала ўступныя іспыты і ўбачыла сваё імя ў спісе бюджэтнікаў.

**— Распавядзіце пра ўражанні ад вучобы. Ці спраўдзіліся вашы чаканні?**

— Шчыра кажучы, мне, як і многім студэнтам, не вельмі падабаецца сядзець на лекцыях. Люблю актыўнасці і практычныя заняткі, напрыклад эстрадны трэнаж, дзе мы вывучаем базу розных стыляў. Прыблізнае ўяўленне аб універсітэцкім жыцці ў мяне было, таму ўсё ідзе па плане. Адзінае, чаго хочацца, — дадаць яшчэ некалькі гадзін да сутак. Не хапае часу: шмат рэпеціруем, рыхтуемся да канцэртаў, а таксама развіваемся па-за ўніверсітэтам.

**— І дзякуючы гэтаму можаце ўдзельнічаць у самых ганаровых дзяржаўных мерапрыемствах. Якія эмоцыі адчуваеце, знаходзячыся на адной сцэне з вядомымі артыстамі?**

— Зусім нядаўна мы выступалі на "Песні года". І я адразу зразумела маштабнасць праграмы, у якой былі задзейнічаны ўсе зоркі беларускай эстрады. Мы працавалі ў камандзе прафесіяналаў, і кожны нумар прапісваўся дакладна па хвілінах. Высокаму ўзроўню адпавядала канцэртная пляцоўка і гукавое суправаджэнне. Гэта класная магчымасць набрацца досведу і пагаварыць са знанымі людзьмі. Да іх прыхільнікі выстройваюцца ў чаргу, каб узяць аўтограф, а ты стаіш на сцэне побач і ствараеш антураж для песень. Крутое адчуванне!

**— Сёння падвядуць вынікі II Рэспубліканскага конкурсу харэаграфічнага мастацтва "Дэнс Кангрэс". Які кірунак вы там прадстаўлялі?**

— Хай-хілс у намінацыі "Сола" (узроставая група 16—21 год). Падаецца, такога "Кангрэс" яшчэ не бачыў. Гэта новы глыток паветра, які разбавіў масу кантэмпарары і эксперыментальнай харэаграфіі. Нумар поўнасцю рабіла самастойна, што дазволіла мне праявіцца як танцорцы і пастаноўшчыцы. Вядома, я прыслухоўваюся да ідэй педагога па балетмайстарскім мастацтве і ўвесь час працую над якасцю харэаграфічнага тэксту. Дарэчы, мы разам з эстрадным аддзяленнем універсітэта праводзілі майстар-клас для ўдзельнікаў "Кангрэса".

**— Але ж на вашым творчым шляху былі бальныя танцы.**

— У бальныя танцы я прыйшла ў 16, што па мерках гэтага спорту лічыцца познім тэрмінам, бо дзеці пачынаюць займацца ў пяць гадоў. На той момант мне хацелася разнастаіць жыццё, ды і сябар прапанаваў адважыцца на "авантуру" разам. Праз нейкі час я зразумела, што бальныя танцы пераследавалі мяне заўжды. Часта з мамай наведвала конкурсы ў якасці гледача: раскошныя сукенкі, рухі і музыка — усё страшэнна захоплівала. Каля года я сур'ёзна рыхтавала цела, трэніравалася штодня па 5—6 гадзін. Мне ўдалося выступіць на рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах і заваяваць золата. Стоячы на найвышэйшай прыступцы п'едэстала, я адчувала неапісальны гонар: мы з партнёрам абышлі пары, якія займаюцца бальнымі танцамі з дзяцінства. Вядома, гэта вынік тытанічнай працы, дзякуючы якой я выхавала ў сабе вытрымку, жаноцкасць і ўпэўненасць, бо на паркет ты павінен выходзіць ужо пераможцам. Думаю, былых бальнікаў не існуе, і калі-нікалі ўва мне прачынаецца жаданне вярнуцца ў тыя часы. На жаль ці на шчасце, у жыцці пачаўся наступны этап у новым горадзе, і ўсе сілы сканцэнтраваны на развіцці ў сценах універсітэта культуры.



Валерыя Клінцова на Першынстве Беларусі па спартыўна-бальных танцах

Кожны танец унікальны: ніхто не выканае яго так, як ты.

**— З якімі яшчэ стылямі танца вы знаёмыя?**

— У гімназіі-каледжы я добра вывучыла народны і эстрадны танец, а таксама класічную базу. Паралельна адкрывала для сябе такія стылі, як хіп-хоп, вэйвінг, пампінг. Спасцігала іх самастойна, гледзячы відэаўрокі на YouTube. Цяпер у маім жыцці шчыльна замацаваўся хай-хілс — стыль, які аб'яднаў бальны кірунак з эстрадным. Гэта танец на высокіх абцасах, што патрабуе стойкасці і вытрымкі.

**— Наогул, што вы ўкладваеце ў паняцце "танец"?**

— Яно асацыіруецца са свабодай. Гэта тое, з чым я прачынаюся і засынаю, што суправаджае мяне цэлы дзень. Кожны танец унікальны: ніхто не выканае яго так, як ты.

У творчых ВНУ ў кожнага асаблівая энергетыка, якая зараджае. Я знаходжуся ў атмасферы, дзе немагчыма не натхняцца. Тут і выкладчыкі, і аднагрупнікі — асобы! Гляджу на іх і разумею, наколькі ўсе таленавітыя і розныя. Гэта і матывуе рабіць сумесныя перформансы, каб усіх здзіўляць.

**— Якой вы бачыце сваю будучыню?**

— Я атрымліваю асалоду ад працы з людзьмі. Мне падабаецца іх навучаць, таму жадаю паспрабаваць сябе ў прафесіі харэографа-пастаноўшчыка. Але не планую адмаўляцца ад ідэі выступаць самой. Хацелася б зрабіць унёсак у айчынную культуру, каб імя Валерыі Клінцовай асацыіравалася з крутымі і маштабнымі работамі!

**Настасся ЮРКЕВІЧ**